Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
____________ В. Р. Языковіч
«_____» ____________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

# СЦЭНАГРАФІЯ ТЭАТРАЛІЗАВАНАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ І СВЯТА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

2019

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя), рэгістрацыйны № С 17-1-77/17 вуч. ад 04.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Г. А. Барвенава*, дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. М. Ермалінская*, загадчык аддзела тэатральнага мастацтва дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*І. У. Яфрэмава*, загадчык кафедры рэжысуры эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

саветам факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 28.02.2018);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 19.04.2018)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Г. А. Барвенава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» – адна са спецыяльных дысцыплін пры падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне святочнай культуры. Мэтанакіраванае і асэнсаванае выкарыстанне архітэктурнага і прыроднага ландшафту, адметнасцей матэрыяльнай культуры Беларусі, законаў кампазіцыі, колеру, святла, вобразных сродкаў сучаснай сцэнаграфіі дапамагае стварыць паўнавартаснае сцэнічнае дзеянне, цэласны выяўленча-пластычны вобраз, які існуе ў сцэнічным часе і прасторы.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» звязана з ведамі, уменнямі і навыкамі студэнтаў, атрыманымі пры вывучэнні дысцыплін «Рэжысура свят» «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства», «Музычна-шумавое вырашэнне свята» і інш. Выкладанне дысцыпліны ва ўзаемасувязі з іншымі дазваляе ў поўнай меры сфарміраваць у студэнтаў глыбокія веды і практычныя навыкі для пошукаў шляхоў вырашэння творчых праблем увасаблення святочных дзеянняў.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» – на аснове ведаў тэорыі і практыкі сучаснай сцэнаграфіі навучыць стварэнню і рэалізацыі ўласных сцэнаграфічных канцэпцый (аўтарскіх рашэнняў).

*Задачы* дысцыпліны:

– авалодаць методыкай стварэння канцэпцыі сцэнаграфічнага вырашэння свят рознай тэматыкі;

– прафесійна ўвасабляць здабыткі матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны Беларусі ў сучаснай святочнай культуры;

– засвоіць прынцыпы арганізацыі прасторы свята сцэнаграфічнымі сродкамі;

– авалодаць асноўнымі мастацкімі і практычнымі пытаннямі пастановачнага комплексу свята;

– ствараць і ўвасабляць на практыцы комплекснае мастацка-дэкаратыўнае вырашэнне свята.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» студэнт павінен

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ведаць:*

– этапы работы над стварэннем комплекснага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;

– адметнасці беларускай культуры, магчымасці яе мастацкай трансфармацыі і падачы ў сцэнаграфіі сучаснага свята;

– асновы стварэння кампазіцыі, каларыстыкі, сімволікі, персанажаў свята, арганізацыі сцэнічнай прасторы і інш.;

– прынцыпы арганізацыі сцэнічнай прасторы, стварэння святочнай атмасферы мастацкімі сродкамі ў залежнасці ад віду і жанру свята;

– асноўныя раздзелы выкладання мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;

*умець:*

– ажыццяўляць праект мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свят рознай тэматыкі, высокапрафесійна ўвасабляць задумы на практыцы;

– будаваць канцэптуальныя палажэнні аўтарскіх рэжысёрскіх і сцэнаграфічных праектаў на аснове ведаў па матэрыяльнай культуры Беларусі;

– ствараць сцэнічную прастору, прадметнае і рухомае візуальнае асяроддзе, святочную атмасферу свята мастацкімі сродкамі;

– выкладаць базавыя пастулаты мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;

*валодаць:*

– методыкай, практычнымі навыкамі стварэння кампазіцыі, каларыстыкі, сімволікі, рэкламы свята, знешняга аблічча персанажа сродкамі касцюміравання, грыму, маскіравання;

– метадамі работы над стварэннем комплекснага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята;

– прынцыпамі стварэння кампазіцыі, каларыстыкі, сімволікі персанажаў свята, арганізацыі сцэнічнай прасторы і інш.;

– метадамі і прыёмамі арганізацыі сцэнічнай прасторы, святочнай атмасферы мастацкімі сродкамі ў залежнасці ад віду і жанру свята;

– методыкай выкладання мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

Метады навучання ў рамках дадзенай вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» маюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэарэтычную і практычную накіраванасць, прадугледжваюць вывучэнне тэхналогій паслядоўнай працы над сцэнаграфіяй свята; развіццё ў студэнтаў вобразна-кампазіцыйнага мыслення; магчымасцей выкарыстання выяўленчых сродкаў пры рэалізацыі аўтарскіх рэжысёрскіх праектаў; прафесійнага афармлення аўтарскіх распрацовак мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

Засваенне матэрыялу вучэбнай праграмы павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый.

*Акадэмічныя кампетэнцыі* спецыяліста:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Валодаць крэатыўнасцю.

АК-9. Умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

АК-10. Валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

*Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі*:

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

*Прафесійныя кампетэнцыі* спецыяліста:

ПК-7. Карыстацца сучаснымі сродкамі тэлекамунікацый і глабальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

ПК-8. Праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і інш.

ПК-11. Кансультаваць кіраўнікоў і ўдзельнікаў творчых, спартыўных, ваенных і інш. калектываў падчас падрыхтоўкі творчых праектаў.

ПК-14. Выкарыстоўваць новыя кірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-17. Распрацоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят, на іх аснове праводзіць рэстаўрацыю, рэканструкцыю ці трансфармацыю ў сучасным свяце.

ПК-18. Ажыццяўляць на аснове культурна-гістарычнай спадчыны новыя святочныя формаўтварэнні ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

На засваенне вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» даецца 428 гадзін, з іх аўдыторных – 216 гадзін (44 гадзіны – лекцый, 144 гадзіны – практычных, 28 гадзін – індывідуальных заняткаў). Форма кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Прадмет, мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны, яе значнасць і месца ў сістэме навучання рэжысёраў свята. Сцэнаграфія і яе месца ў выяўленчым мастацтве. Гісторыя і асноўныя этапы развіцця сцэнаграфіі. Перспектывы развіцця і праблемы ўдасканалення сучаснай сцэнаграфіі.

### *Тэма 1. Сцэнаграфія як мастацкая з'ява. Тэрміналагічная база*

Сцэнаграфія як матэрыяльна ўвасоблены элемент зрокавага вобраза свята. Месца сцэнаграфіі ў свяце. Паняцце выразных і выяўленчых сродкаў сцэнаграфіі. Выразныя сродкі сучаснай сцэнаграфіі. Асноўныя функцыі сцэнаграфіі ў мастацкім дзеянні: гульнявая, дэкаратыўная, персанажная. Спецыфіка працы тэатральнага сцэнографа і сцэнографа свята. Сцэнарый–рэжысёр–мастак. Роля сцэнографа ў інтэрпрэтацыі мастацкага вобраза драматургіі. Супрацоўніцтва рэжысёра і мастака-пастаноўшчыка пры стварэнні візуальнага вобраза свята. Творчая група сцэнографа. Асноўныя формы арганізацыі прасторы свята. Методыка збору матэрыялу для стварэння адметнага мастацкага вобраза, адметнага аўтарскага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

## Раздзел I. Тэхніка і тэхналогія сцэны

### *Тэма 2. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні*

Гісторыя і асноўныя этапы развіцця сцэнаграфіі і сцэнічнай прасторы. Сцэна антычнага тэатра. Сімультанная сцэна сярэдневяковых прадстаўленняў. Узнікненне сцэны-скрыні. Сцэна англійскіх ярусных тэатраў і італьянская сцэна. Сцэна, машынерыя, дэкарацыі Нясвіжскага, Слонімскага і іншых тэатраў XVII–XVIII стст. Сцэны XIX – пачатку XX ст. Сучасныя сцэны Беларусі.

### *Тэма 3. Класічная сцэна-кодаб. Абсталяванне сцэны*

Класічны кодаб сцэны. Залатое сячэнне як прынцып вымярэння кодаба сцэны. Сцэна і глядзельны зал. Наладжванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэны і закулíснай прасторы. Асноўныя часткі сцэны: планшэт і сцэнічная гульнявая прастора, верхняя сцэна, ніжняя сцэна (трум), авансцэна, сцэнічныя кішэні, ар'ерсцэна, каласнікі, аркестравая яма, дапаможныя памяшканні сцэны (кішэні), галаснікі. Планы сцэны: авансцэна, цэнтр, пакат.

Тэхнічнае абсталяванне і механізацыя сцэны. Наладжванне і функцыі механічнага абсталявання (кулісныя машыны, штанкетныя пад'ёмы, вярчальная сцэна, колы, фуркі, пад'ёмна-апускальныя пляцоўкі, транспарцёры, тэлары, люк, трум і інш.).

Планшэт і яго механізмы. Канструкцыя планшэта сцэны; пад'ёмна-апускальныя планы сцэны; пад'ёмна-апускальныя пляцоўкі сцэны; рухомыя планшэты сцэны (кругі ўрэзаныя, накладныя, барабанныя); рухомыя колы; транспарцёр; адтуліны і люкі; кулісныя машыны; накладны планшэт сцэны; накатныя пляцоўкі і рухомыя планшэты. Верхняе абсталяванне сцэны. Штанкетныя пад'ёмы; індывідуальныя пад'ёмы, палётныя ўстаноўкі. Сістэма індывідуальных пад'ёмаў.

Адзенне сцэны. Кулісы, падугі, заднікі. Заслоны. Віды заслон па функцыі: антрактныя і інтэрмедыйныя. Па тэхніцы: пад'ёмна-апускальныя, камбінаваныя, фігурныя. Панарамы і гарызонты. Пад'ёмна-апускальны і перасоўны гарызонт. Іграву заднік сцэны, генеральная заслона. Шырмы, шторы.

Дэкарацыі. Тыпы, віды, прызначэнне, манціраванне, эксплуатацыя. Дэкарацыі на каркаснай аснове, бескаркасныя, разборныя, стацыянарныя, рухомыя. Мяккія дэкарацыі. Заслоны: асноўная антрактавая, заслона-раздзержка, іграваяя. Жорсткія дэкарацыі: станкі лесвіцы, парэнчы, балюстрады, аб'ёмна-каркасныя дэкарацыі. Мацаванне дэкарацый да планшэта, верхавога абсталявання, дэкарацый.

Бутафорыя. Тэатральная мэбля. Тэатральныя фактуры і імітацыя. Прасцейшыя тэхналогіі распрацоўкі, пабудовы, зборкі, мантажу павільённай дэкарацыі.

Святло. Асвятленне. Каляровае асвятленне: святлафільтры, каляровыя трансфармацыі, асвятленне дэкарацый, лакалізаванае асвятленне. Праекцыі: асвятленне сцэны пры праекцыі, экран, барэльефныя праекцыі, кіно. Імітацыя і эфекты (з'явы прыроды, агонь).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы*

Сцэна-арэна, стадыён, сімультанная сцэна, прасторавая сцэна. Сувязь памераў класічнага кодаба-сцэны і сцэн на адкрытай прасторы. Паняцце «асяроддзе». Кампаненты візуальнага асяроддзя свята. Натуральнае прадметнае асяроддзе: архітэктура, прыродны ландшафт, інтэр'ер і інш. Штучнае прадметнае асяроддзе: стацыянарныя малыя архітэктурныя формы – сцэнічныя пляцоўкі, аказіянальная архітэктура, афармленне фасадаў будынкаў, гульнявыя атракцыёны, выставы аднаго дня і г. д. Рухомае асяроддзе: карнавальныя і іншыя шэсці; дэкарыраваныя рухомыя ўстаноўкі. Светлавое і гукавое абсталяванне на адкрытай прасторы. Сцэнічная і пазасцэнічная бутафорыя.

Узаемасувязь памеру сцэны і навакольнага асяроддзя. Асаблівасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята з улікам прыроднага ландшафту (лесапаркавая зона, вадаём), архітэктурнага ландшафту (замак, вуліца, плошча). Уплыў архітэктурнага і прадметнага асяроддзя (рэльеф, вадаём, помнік) на мастацка-вобразнае вырашэнне свята. Месца правядзення традыцыйных беларускіх свят і яго трансфармацыя. Сучасныя адкрытыя сцэнічныя пляцоўкі.

## Раздзел II. Асновы мастацкага вырашэння свята

### *Тэма 5. Асновы кампазіцыі*

Паняцце «кампазіцыя». Змест формы (лінія, пляма, аб'ём, кампазіцыйная структура). Катэгорыі кампазіцыі (тэктоніка, аб'ёмна-прасторавая структура).

Выяўленчая плоскасць: характарыстыкі выяўленчай плоскасці, што ўспрымаецца як паверхня і як прастора. Кампазіцыя на плоскасці, залежнасць кампазіцыі ад кампазіцыйнай рамы. Узаемадзеянне плоскасці, плямы, лапіны.

Перспектыва як адлюстраванне прасторы на плоскасці. Лінейная перспектыва, перцэпцыйная, адваротная, танальная, святлопаветраная. Адлюстраванне ў аксанаметрыі.

Кампазіцыйная структура (тэктоніка) у творах выяўленчага мастацтва. Структурныя «сілавыя» лініі, геаметрычныя кампазіцыйныя схемы, нематэрыяльныя, але рэальна адчувальныя ў якасці арганізуючага каркасу кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уласцівасці і якасці кампазіцыі (гарманічная цэласнасць, падпарадкаванасць элементаў, кампазіцыйная раўнавага, адзінства стылю, вобразнасць формы). Шэраг супадпарадкавання паміж усімі часткамі цэлага. Гарманічная цэласнасць патрабуе мэтанакіраванага выкарыстання ўсіх сродкаў кампазіцыі. Якасная мера. Колькасная мера. Суразмернасць. Кампазіцыйнае пачуццё меры.

Заканамернасці кампазіцыі. Сіметрыя. Віды сіметрыі: цэнтральная, прамянёвая, радыяльная, люстэркавая, паралельны перанос, спалучэнне розных відаў сіметрыі. Асіметрыя – аснова дынамічнай напружанай раўнавагі кампазіцыі.

Сродкі кампазіцыі (прапорцыі, маштаб, кантраст, нюанс, метрычныя паўторы, рытм). Прапорцыя як адзін з істотнейшых сродкаў для характарыстыкі мастацкага вобраза. Канон Паліклета. Модуль. Залатая прапорцыя. Залатое сячэнне.

Маштаб. Табліца маштабаў. Маштабнасць – суадносіны арганізаванай прасторы з фігурай чалавека. «Чалавек – мера ўсіх рэчаў». Чалавек – кампазіцыйны модуль мастацкай прасторы.

Вызначэнне рытму і метра. Роля рытму як аднаго са сродкаў гарманізацыі формы. Кампазіцыйная раўнавага, заснаваная на метры, – паказ статыкі. Дынамічна-напружаная раўнавага – паказ руху.

Арганізацыя дамінантных адносін фармальных элементаў кампазіцыі. Кампазіцыйная актыўнасць асноўных элементаў (персанажаў) фармальнай арганізацыі: кропкі, лініі, плямы, прасторы. Арганізацыя прасторавых сувязей і адносін паміж элементамі кампазіцыі. Адзінства ў арганізацыйнай структуры фармальнай кампазіцыі складаючых яе элементаў і прасторы. Ступень, інтэнсіўнасць і накіраванасць прасторавай актыўнасці сілавога поля элемента (яго канфігурацыя, маштаб, колер, тон, фактура, месца ў прасторы, рух адносна вертыкалі і гарызанталі, узаемадзеянне з іншымі сілавымі палямі і інш.) на навакольную прастору.

Прыёмы і метады працы над кампазіцыяй. Выбар асноўнай ідэі кампазіцыі і рэалізацыя яе на ўсіх этапах працы. Стылістычнае адзінства. Псіхафізіялагічнае ўспрыманне кампазіцыйна арганізаванай формы гледачом. Агульныя законы псіхалогіі візуальнага ўспрымання розных форм. Уменне рэжысёра і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастака свядома кіраваць дынамікай і эмацыянальнай актыўнасцю візуальнага ўспрымання гледача.

### *Тэма 6. Колеразнаўства*

Вучэнне пра колеры. Колер. Трыяда – чырвоны, белы, чорны, яе стыхіі. Сістэмы стыхій і колераў у розных культурах. Традыцыйная беларуская сімволіка колераў. Геральдычныя колеры і колеры ўлады.

Фізічныя і эстэтычныя ўласцівасці колеру. Ахраматычныя і храматычныя колеры. Характарыстыка колеру: тон, светлата, насычанасць. Спектральнае кола. Асноўныя і дадатковыя колеры. Гармонія і дысгармонія колераў. Колеравыя суадносіны. Каларыт. Кантраст і нюанс як прынцыпы каларыстычнай гарманізацыі. Каларыстычная гама свята. Эмацыянальна-псіхалагічнае ўздзеянне колеру: спакой – напружанасць, цяпло – холад, цяжар – лёгкасць, мяккасць – жорсткасць і г. д., асацыяцыі, семантыка. Сімвалічная значнасць колеру. Колер як актыўны сродак вобразнай характарыстыкі, які звязаны з ідэяй, стылістыкай свята, індывідуалізацыяй персанажа. Сінтэз колеру і гуку.

Колеры свята. Сутнасная насычанасць колераў свята, адпаведнасць тэме і ідэі, вобразнай стылістыцы. Колер як адзін са спецыфічных сродкаў эстэтычнай эмацыянальнай выразнасці, кампанент мастацкага вобраза, сродак характарыстыкі сцэнічных дзей і персанажаў. Кіраванне ўвагай гледача пры дапамозе колеру, прыцягванне ўвагі да персанажаў, рэчаў ці дзеянняў у пэўнай паслядоўнасці: ад галоўнага да другараднага і наадварот. Сімволіка колераў свята. Выкананне ўсіх мастацка-дэкаратыўных элементаў свята з дамінантай абраных колераў.

### *Тэма 7. Вобразныя сродкі сцэнаграфіі свята*

Асновы мастацкага вырашэння сцэнаграфіі свята. Кампазіцыя прасторы. Адзінства, падпарадкаванасць, раўнавага, паўтор. Рытм, тэктоніка, пластычнасць, кантраснасць, структурнасць, функцыянальнасць. Выкарыстанне выяўленчых сродкаў сцэнаграфіі: колеру, лініі, формы, фактуры, тэкстуры пры стварэнні кампазіцыі. Гармонія, дысгармонія, каларыт, сім-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валізм. Дынаміка, статыка, прапарцыянальнасць. Псіхалагічнае ўздзеянне на гледача, 25 кадр.

Асаблівасці пабудовы прасторавай кампазіцыі і выкарыстання вобразных сродкаў сцэнаграфіі на сцэне-кодабе і на адкрытай прасторы. Выкарыстанне законаў перспектывы. Спалучэнне выразных сродкаў плоскаснай і аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі ў трохмернай прасторы сцэны. Выкананне замераў і пралік суадносін памераў плошчы, ландшафтнай прасторы са сцэнічнай пляцоўкай і глядзельнымі шэрагамі. Прапорцыі, кантраст, каларыт, свет. Ракурс, дынаміка, планы (буйны, сярэдні, агульны). Актор, сцэнічная маска, лялька, грым ва ўмовах сцэны-кодаба і ва ўмовах адкрытай прасторы. Сучасная тэатральная тэхніка і яе месца ў сцэнаграфіі свята. Прасторавы, колеравы, выяўленчы, дэкаратыўны, канструктыўны шляхі вырашэння сцэнаграфіі свята. Інфарматыўнасць, функцыянальнасць сцэнаграфічнага вырашэння свята, суадносіны кошт–вынік.

Спосабы фіксацыі задумы мастацкага вырашэння свята: эскіз, планіроўка, макет, графіка, камп'ютарная графіка і інш. Маштаб, агульнапрынятыя маштабы ў пастановачнай практыцы.

### *Тэма 8. Стылістычнае адзінства.*
### *Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята*

Паняцці «стылістыка», «стылістычнае адзінства» мастацкага твора. Адпаведнасць кампазіцыі, сімволікі, колеру, сімвала, сцэнаграфіі пляцовак свята адзінай стылістыцы.

Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята: каляндарна-абрадавых свят, тэматычных, дзіцячых, спартыўных. Узаемасувязь месца і часу правядзення свята, асобных комплексаў свята з жанравымі асаблівасцямі, тэматыкай, узроставай катэгорыяй гледачоў. Асаблівасці сцэнаграфічнага аздаблення пляцовак каляндарна-абрадавых, дзіцячых і інш. свят. Актывізацыя гледача пры дапамозе сцэнаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Канцэпцыя сцэнаграфічнага вырашэння сучаснага свята

### *Тэма 9. Сучасная сцэнаграфія. Сцэнаграфія сучасных свят Беларусі*

Сучасныя святы і іх сцэнаграфія. Выкарыстанне сучаснай тэхнікі ў сцэнаграфіі, мастацкія знаходкі. Сучасная святочная культура Беларусі. Мастацкія, тэматычныя дасягненні і праблемы. Сучасны беларускі нацыянальна-народна-сцэнічны вобраз. Увасабленне эпохі на тэатральнай і пазатэатральнай сцэне. Гістарычная і народная тэматыка ў выяўленчым мастацтве, кіно, святах. Тэматыка і мастацкі вобраз масавых паратэатральных дзей.

Выкарыстанне здабыткаў матэрыяльнай культуры Беларусі ў кантэксце сучаснага свята (аўтэнтыка, рэканструкцыя, рэстаўрацыя; сімвалізм, знакавасць і інш.). Знакі-сімвалы культуры Беларусі і іх увасабленне ў сучаснай святочнай прасторы. Месца традыцыйнай культуры ў сучаснай святочнай прасторы Беларусі. Традыцыі і штампы ў сцэнаграфіі сучасных народных свят.

Стварэнне пазнавальнага аўтарскага мастацкага вобраза (сцэнаграфічнага вобраза) свята. Праца рэжысёра з мастаком. Асноўныя этапы працы. Збор і асэнсаванне візуальнага і факталагічнага матэрыялу. Эскізная распрацоўка. Архітэктоніка і функцыянальнасць вобразнага вырашэння свята. Спосабы вырашэння сцэнічнай прасторы. Маштаб, прапорцыі, статыка, дынаміка і інш. складнікі мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

### *Тэма 10. Матэрыяльная і нематэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята*

Магчымасці і варыянты выкарыстання помнікаў архітэктуры, мастацтва, нематэрыяльнай культуры ў сцэнаграфіі сучасных свят. Культавыя помнікі, замкі, палацы, садова-паркавыя ансамблі, творы мастацтва, геральдыка, этымалогія назваў як сродак гістарычнай і сацыяльнай характарыстыкі падзей, персанажаў у паратэатральным дзеянні. Матэрыяльная культура магнатэрыі, шляхты і гараджан, гістарычны касцюм,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зброя ў сцэнаграфіі сучаснага свята. Месца старашляхецкіх жупанова-кунтушовых строяў у святочнай культуры.

Традыцыйнае мастацтва Беларусі ў сцэнаграфіі сучаснага свята. Выкарыстанне традыцыйнага дойлідства, адметнасцей гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў, сімволікі і семантыкі побытавых рэчаў, арнаментыкі ў святочнай культуры. Касмалогія (качарга, засланка, патэльня, рэшата), дэманалогія (жырандоль, венік), касмагонія (грэбень, хлебная лапата), антрапамарфізмы (гаршчок, дзяжа, лыжка), эратызмы (ступа і таўкач, хамут) у штодзённай і святочнай культуры. Беларускі традыцыйны строй на сямейна-абрадавых і каляндарна-абрадавых святах, рэгіянальныя адметнасці. Выкарыстанне семантыкі, семіётыкі, сімволікі беларускага традыцыйнага строю і яго элементаў у традыцыйнай і сучаснай штодзённай і святочнай культуры. Выкарыстанне адметнасцей строю нацыянальных меншасцей Беларусі пры стварэнні сцэнічнага вобраза. Міфалогія і міфалагічныя персанажы, іх вобраз-«касцюм» у сцэнаграфіі свята.

Месца і выкарыстанне сімволікі ў вобразным вырашэнні свята і яго мастацка-дэкаратыўным афармленні. Паняцці «сімвал», «сімволіка». Паняцці «дзяржаўная», «нацыянальная», «народная сімволіка». Выкарыстанне дзяржаўнай сімволікі ў святочнай культуры. Геральдыка. Каралеўская, вялікакняжацкая, княжацкая, магнацкая, шляхецкая, гарадская геральдыка. Месца і выкарыстанне геральдыкі ў вобразным вырашэнні свята і яго мастацка-дэкаратыўным афармленні. Канфесійная сімволіка і правілы выкарыстання яе ў свяце. Паганская міфалогія і яе сімвалы-вобразы: Сусвет, Зямля, Неба і інш.; сакральныя знакава-сімвалічныя матывы і візуальна-знакавыя архетыпы (дрэва жыцця, Маці, Адраджэнне, птушка і інш.). Беларускі традыцыйны арнамент і яго сімволіка. Сімволіка колераў у традыцыйнай народнай культуры. Жыццёва-абрадавае кола і сімволіка лічбаў у традыцыйнай культуры беларусаў. Сімвалічная атрыбутыка Каляд, Гукання вясны, Купалля, Багача, Дзядоў і іншых каляндарных абрадаў і свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Выбар і афармленне канцэпцыі мастацка-дэкаратыўнага вырашэння трох свят*

Рост патрабаванняў да тэматычнай, гістарычнай і этнічнай адпаведнасці, мастацкіх вартасцей сцэнічнага вобраза. Методыка пошуку арыгінальнага мастацкага вырашэння свята. Тэкставае апісанне і візуальная падача матэрыялу для стварэння сцэнаграфіі трох задуманых студэнтамі свят. Святы, прысвечаныя тром кірункам: тэматычнае свята, каляндарна-абрадавае свята, пазаабрадавае свята. Сістэма пошуку тэматычнага свята. Крытэрыі ацэнкі мастацкіх і функцыянальных вартасцей сцэнаграфіі трох абраных студэнтамі свят.

Распрацоўка тэматыкі, назвы, часу, дзеючых асоб тэматычнага свята. Выкарыстанне ў сцэнаграфіі тэматычнага свята ведаў пра гістарычных асоб ВКЛ, матэрыяльную культуру, касцюм, зброю розных часавых і стылістычных кірункаў на землях Беларусі. Распрацоўка сцэнічнага вобраза праз паказ адметнасцей поглядаў, касцюмаў, элементаў матэрыяльнай культуры.

Час свята. Правілы вызначэння часу пачатку і заканчэння свята, найбольш спрыяльных для рэалізацыі творчай задумы рэжысёра-пастаноўшчыка. Адпаведнасць святам, што адбываюцца ў дзяржаве, рэгіёне ў прызначаны для вашага свята час. Адпаведнасць святам па блізкай тэматыцы. Перыядычнасць свята. Гістарычнасць і традыцыйнасць пачатку свята. Час свята і працягласць павінны адпавядаць жыццёваму цыклу большасці аўдыторыі, асабліва дзіцячыя святы.

### *Тэма 12. Кампазіцыя свята*

Мастацкая арганізацыя прасторы свята сродкамі сцэнаграфіі. Кампазіцыйная пабудова свята (архітэктоніка) у мастацка-дэкаратыўным вырашэнні. Канкрэтыка і сімволіка ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Асацыятыўнасць, абагульненне, умоўнасць. Жанрава-стылістычная адпаведнасць агульнай рэжысёрска-сцэнаграфічнай канцэпцыі свята.

Лінейная кампазіцыя свята. Кампазіцыйная структура (тэктоніка) у творах мастацтва. Структурныя «сілавыя» лініі, геаметрычныя кампазіцыйныя схемы, нематэрыяльныя, але рэальна адчуваемыя ў якасці арганізуючага каркасу кампазіцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уласцівасці і якасці кампазіцыі свята (гарманічная цэласнасць, супадпарадкаванасць элементаў, кампазіцыйная раўнавага, адзінства стылю, вобразнасць формы). Падпарадкаванні частак цэламу. Гарманічная цэласнасць, якасная мера, колькасная мера, суразмернасць. Кампазіцыйнае пачуццё меры.

Прыёмы і метады працы над кампазіцыяй свята. Выбар асноўнай ідэі кампазіцыі і здзяйсненне яе на ўсіх этапах працы. Стылістычнае адзінства. Псіхафізіялагічнае ўспрыманне кампазіцыйна арганізаванай формы гледачом. Агульныя законы псіхалогіі візуальнага ўспрымання розных форм графічнага адлюстравання, а таксама на выяўленні тых прынцыпаў, якія даюць магчымасць рэжысёру і мастаку свядома кіраваць дынамікай і эмацыянальнай актыўнасцю візуальнага ўспрымання гледача.

### *Тэма 13. Колеравае вырашэнне свята*

Месца сістэмы стыхій і колераў розных культур у сцэнаграфіі сучаснага свята. Традыцыйная беларуская сімволіка колераў у сцэнаграфіі свята. Месца геральдычных колераў у сцэнаграфіі свята

Сімвалічныя і эстэтычныя ўласцівасці абранай колеравай палітры свята. Паняцце «галоўны колер» свята. Выкарыстанне законаў вучэння пра колеры для стварэння палітры свята. Ахраматычныя і храматычныя колеры; характарыстыка колеру: тон, светлата, насычанасць. Спектральнае кола. Асноўныя і дадатковыя колеры. Гармонія і дысгармонія колераў. Колеравыя суадносіны. Каларыт. Кантраст і нюанс як прынцыпы каларыстычнай гарманізацыі. Каларыстычная гама свята. Эмацыянальна-псіхалагічнае ўздзеянне колеру: спакой–напружанасць, цяпло–холад, цяжар–лёгкасць, мяккасць–жорсткасць і г. д., асацыяцыі, семантыка. Сімвалічная значнасць колеру. Колер як актыўны сродак вобразнай характарыстыкі, які звязаны з ідэяй, стылістыкай, індывідуалізацыяй. Сінтэз колеру і гуку.

Колер у сцэнаграфіі свята, прапанаванага студэнтам: шматколерная кампазіцыя, якая характарызуе прапанаванае свята; пісьмовае тлумачэнне абраных колераў, пацверджанае сабраным факталагічным матэрыялам (геральдыка, традыцыйны арнамент і г. д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 14. Персанажы свята. Касцюміраванне, грым*

Персанаж свята, імя, характар. Касцюм, грым, бутафорыя, аксесуары як сродкі вобразнай характарыстыкі персанажа. Гістарычныя персанажы. Персанажы традыцыйных каляндарна-абрадавых і сямейна-абрадавых свят. Міфалагічныя персанажы. Выкарыстанне ведаў па міфалогіі, традыцыйнай культуры Беларусі пры стварэнні візуальнага вобраза персанажа.

Сцэнічны касцюм у святе. Касцюм і жанр свята. Касцюм у тэатралізаваным відовішчы – сродак пераўтварэння персанажаў. Умоўнасць. Абагульненне і ўзбуйненне формы. Сілуэт. Дэталь замест цэлага. Трансфармацыя аб'ёму, сілуэта, колеру, вобраза. Адметнасці касцюма, бутафорыі ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята ў закрытым памяшканні і на адкрытай прасторы.

Гісторыя станаўлення беларускага сцэнічнага касцюма. Касцюмы сярэдневяковых дзей, касцюмы прыдворных тэатраў князёў Радзівілаў, Сапегаў, школьнага тэатра XVII–XVIII стст., тэатраў В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Буйніцкага і У. Галубка. Стварэнне беларускага народнага хору і ўплыў на далейшае развіццё народна-сцэнічнага касцюма. Стварэнне шматпланавых прафесійных калектываў і масавае развіццё мастацкай самадзейнасці ў 50–60 гг. XX ст. Стварэнне ў 1958 г. спецыялізаванага камбіната па вытворчасці сцэнічных касцюмаў пры Беларускім тэатральным аб'яднанні (з 1990 г. Саюз тэатральных дзеячаў) і дзейнасць Рэспубліканскага савета па сцэнічным касцюме пры Міністэрстве культуры (1981–1986 гг.). Даследчая і творчая дзейнасць Л. Баразны, М. Раманюка, Ю. Піскуна і інш. у галіне сцэнічнага касцюма. Сучасныя тэндэнцыі ў касцюмалогіі.

### *Тэма 15. Сімволіка свята*

Паняцце «сімволіка свята». Патрабаванні да збору матэрыялу для стварэння сімволікі свята. Крытэрыі ацэнкі, знакавасць і інфармацыйная насычанасць; мастацкія вартасці сімволікі ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Выкарыстанне геральдыкі ў святе. Падбор матэрыялу на тэматычнае свята, абранае студэнтам. Гербы, сцягі, звязаныя з геральдыкай уладальнікаў горада, замка. Легенды, гістарычныя факты і іх выкарыстанне ў святе.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Асноўныя прынцыпы пабудовы сімволікі свята: а) візуальнае стылізаванае адлюстраванне тэмы і мэты свята; б) візуальны шэраг (знак-сімвал, абрысы горада, асобнага будынка, картаграфія, партрэт, элементы каралеўскай, гарадской і іншай сімволікі, элемент агульнавядомага культурнага феномена (слуцкія паясы, гравюры Ф. Скарыны), тэкст, аўтограф і інш.; в) абрамленне: картуш (дзяржаўная, гістарычная сімволіка), геаметрычныя формы (кола, авал, барочныя формы), раслінныя (віньеткі, вянкі, гірлянды, лісце, каласы, кветкі і інш.); г) легенда, дэвіз, дата; д) адпаведнасць абранай стылістыцы свята; е) адпаведнасць абраным колерам свята.

Шрыфт. Назва свята і шрыфт. База шрыфтоў. Паняцце «фірменны шрыфт».

Асаблівасці і правілы пабудовы сімволікі дзяржаўнага, канфесійнага свята, тэматычнага свята, свята, прысвечанага класічнай тэматыцы, спартыўнага свята, дзіцячага свята і інш. Выкарыстанне ў сімволіцы свята традыцыйных сімвалаў (паганская сімволіка, элементы арнаменту, агульнапрынятая сімволіка народных свят): калядная зорка, вогнішча, птушка, свечка, хлеб на ручніку, зерне, сноп і інш.; элементы народнага побыту – ручнік, жбанок, калодзеж-жораў; прынятыя сімвалы: бусел, зубр і інш. Недапушчальнасць паралельнага ўжывання дзяржаўнай, магнацкай, гарадской, народнай сімволікі. Недапушчальнасць натуралізму як у сімволіцы, так і ў афармленні свята.

### *Тэма 16. Месца свята*

Выбар месца правядзення свята або ацэнка прыродных ці архітэктурна-мастацкіх вартасцей прапанаванага месца. Крытэрыі выбару месца правядзення свята, крытэрыі ацэнкі. Культурныя і гістарычныя вартасці месца правядзення свята. Месца традыцыйнага правядзення свята. Пошук месца, якое найбольш адлюстроўвае тэматыку пазаабрадавага свята. Дакладна вызначаная тэрыторыя свята і яе пазначэнне. Зручнасць месца для ўдзельнікаў і гледачоў: сцэнічныя пляцоўкі, глядзельная прастора, службы, шляхі, размяшчэнне ўдзельнікаў і г. д.

Роля рэжысёра і мастака ў пераўтварэнні пазасцэнічнай прасторы ў прастору масавага тэатра. Аналіз прыродных і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

архітэктурна-мастацкіх вартасцей месца свята. Культурныя, гістарычныя, мастацкія, эстэтычныя якасці асяроддзя свята. Уключэнне антыасяроддзя ў вобразную тканіну свята праз пераасэнсаванне яго знешняга выгляду: ператварэнне ў дамінанту свята або моманту свята; перанос галоўнай пляцоўкі на дыяметральна супрацьлеглы бок і не акцэнтаванне на іх увагі і г. д. Удзел гледачоў у арганізацыі ці рэарганізацыі сцэнічнай прасторы. Рэарганізацыя – акт відовішча, элемент сцэнічнага дзеяння. Правільная арганізацыя сцэнічнай прасторы – умова ўстойлівага эмацыянальнага кантакту з гледачамі.

Асаблівасці арганізацыі прасторы свята ў закрытым памяшканні. Выкарыстанне неабходных і магчымых сцэнічных пляцовак – прасторы вулічнай плошчы, хола, памяшканняў у мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята. Галоўная сцэнічная пляцоўка. Скрыня сцэны і чалавек-модуль. Асаблівасці дэкарацыйнага афармлення ў закрытым памяшканні: лінейная перспектыва, паветраная перспектыва, сцэнічная ўмоўнасць і інш. Архітэктурны і сцэнічны план сцэнічнай прасторы. Прамяні бачнасці сцэнічнай прасторы, рамы, авансцэны, куліс, люстэркавыя лініі. Сцэнічныя планы і іх пабудова. Мізансцэны.

Спецыфіка выразных сродкаў сцэнаграфіі свята на адкрытай прасторы. Формы, прыёмы, спосабы арганізацыі глядзельнага ўспрымання: першаснасць відовішча, дамінанта візуальных сродкаў, працягласць мізансцэн, мінімальнае выкарыстанне акцёрскага майстэрства, знак-сімвал, рух – гук – святло, глядач – удзельнік. Памер пляцоўкі і рэальнасць навакольнага асяроддзя. Тэхнічныя магчымасці сучасных адкрытых сцэнічных пляцовак як прыцягальная сіла і сродак канцэнтрацыі ўвагі глядзельнай аўдыторыі. Асаблівасці мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята ў горадзе (вуліца, плошча), на адкрытай прасторы (лесапаркавая зона, вадаём). Прадметнае асяроддзе (рэльеф, вадаём, унікальны аб’ект) як фактар, што актыўна ўплывае на мастацка-вобразнае вырашэнне свята. Месца правядзення традыцыйных беларускіх свят і яго трансфармацыя.

Арганізацыя прасторы свята па гарызанталі і вертыкалі. Уключэнне ў вобразны строй кампазіцыі, акрамя сцэнічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ёмаў, прасторы паміж імі. Вырашэнне будынкаў, фасадаў і інш. Актыўнае выкарыстанне прасторы над вуліцай, плошчай, стадыёнам. «Неба» ў дзённай і начной святочнай прасторы. Колер як «дысцыплінаванне» сцэнічнай прасторы горада. Узаемадзеянне святла, колеру і гуку.

Масавыя відовішчы. Стварэнне выяўленчых кампазіцый, якія бесперапынна развіваюцца ў часе і прасторы. Дамінанта маштабных дынамічных кампазіцый з тысячай выканаўцаў, адзінкавых герояў, буйнамаштабных лялек, палотнішчаў, планшэтаў, транспарантаў, піратэхнічных эфектаў і інш. Сімвалічныя вобразы-алегорыі. Пластычная, каларыстычная і інш. арганізацыя ўзаемадзеяння саліста і масы, героя і натоўпу.

Пабудова, шыхтаванне і разлік фігур на плошчы, стадыёне, адкрытай пляцоўцы. Пабудова і разлік фігур на сцэнічнай пляцоўцы. Прынцыпы размяшчэння актораў і гледачоў у адносінах адзін да аднаго (асявы і цэнтравы) на сцэне. «Правы» і «левы» выхады актораў. Цэнтравы прынцып размяшчэння актораў і гледачоў на прасторавай сцэне. Схемы мізансцэн.

Адпаведнасць афармлення галоўнай і іншых пляцовак сцэнаграфічнаму вобразу свята. Распрацоўка генеральнага плана тэрыторыі свята, архітэктурна-мастацкага вырашэння галоўнай пляцоўкі свята, шэсця, кірмашу, гульнявых і інш. пляцовак, памежных тэрыторый; ацэнка праектаў і эскізаў, мастацка-тэхналагічнага ўзроўню выканання. Карта свята ў штабных гульнях, рэкламна-інфармацыйнай прадукцыі.

### *Тэма 17. Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята*

Стварэнне перад-, святочнай і паслясвяточнай атмасферы свята.

Мэты рэкламы: прыцягнуць увагу, паведаміць мэту і канцэпцыю свята, сабраць мэтавую аўдыторыю, падрыхтаваць гледача да ўспрымання дзеяння. Калі свята адбываецца ўпершыню, рэклама павінна паведамляць неабходныя гістарычныя і інш. звесткі. Прызавы фонд. Стварэнне паслясвяточнай атмасферы, сувенірная і іншая прадукцыя.

Віды рэкламы: друкаваная (афіша, расцяжка і інш.); медыйная ці сродкі масавай інфармацыі (тэлевізійная, радыёрэклама, рэклама ў прэсе, інтэрнэт-рэклама, вонкавая рэклама); запра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэнне (персанальнае, адраснае); гульнявая (міні-канцэрт); флэшмоб; транзітная рэклама (на транспарце) і інш.

Прынцыпы рэкламы: інфармацыйнасць; выразнасць тэматыкі, выкарыстанне сімволікі свята; стылістычнае адзінства; псіхалагічнае ўздзеянне на гледача; прафесіяналізм; арыгінальнасць задумы.

## Раздзел IV. Работа мастака-пастаноўшчыка над комплексным мастацка-дэкаратыўным вырашэннем свята

### *Тэма 18. Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы*

Аргкамітэт свята, яго склад і задачы структурных падраздзяленняў. Творчае супрацоўніцтва рэжысёра і мастака. Сінтэз сцэнаграфіі і рэжысуры. Творчая група сцэнаграфіі свята, склад, функцыянальныя абавязкі ўдзельнікаў і галоўныя прынцыпы працы.

Паслядоўнасць і асноўныя этапы сцэнаграфічнага вырашэння свята. Шлях ад задумы да эскізных распрацовак. Роля рэжысёра ў падачы матэрыялу для сцэнаграфічнага вырашэння свята. Складанне дакументацыі. Паслядоўнасць узгаднення і рэалізацыі сцэнаграфіі свята.

### *Тэма 19. Складанне праекта комплекснага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята*

Стварэнне сцэнаграфіі трох абраных студэнтамі свят (тэматычнае, каляндарна-абрадавае, пазаабрадавае) па дадзенай схеме:

Назва свята. Тэма, мэта, задачы свята. Актуальнасць.

Час і месца правядзення свята. Аргументацыя.

Колеравае вырашэнне свята. Каларыстычная палітра як сродак выяўлення задумы свята. Колер у вобразна-мастацкім абліччы свята. Суадносіны колераў на свяце. Каларыстычная карта свята.

Персанажы свята. Аргументацыя, імёны ці мянушкі, візуальны шэраг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сімволіка свята (знак-сімвал, легенда, прынцыпы пабудовы, шрыфт).

Кампазіцыя свята. Лінейная кампазіцыя.

Генеральны план тэрыторыі свята і памежных тэрыторый.

Сцэнаграфія галоўнай пляцоўкі свята.

Эскізная распрацоўка асобных комплексаў свята: выстава, дзіцячая пляцоўка, шэсце, кірмаш і інш.

Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята.

### *Тэма 20. Крытэрыі ацэнкі мастацкіх вартасцей эскізаў і выкананых работ*

Арыгінальнасць і аргументаванасць абраных ідэі, тэмы, мэты, назвы трох прапанаваных студэнтамі свят. Адпаведнасць іх святочнай культуры Беларусі, актуальнасць, мэтазгоднасць абраных месца і часу свята. Выкарыстанне асаблівасцей традыцыйнай і сцэнічнай культуры папярэдніх пакаленняў.

Арыгінальнасць мастацкага аблічча свята і цэласнасць яго ўнутранай структуры. Здольнасць ясна, лагічна, кампазіцыйна выверана пабудаваць, у адпаведнасці з пастаўленымі задачамі, свята. Адпаведнасць мастацка-дэкаратыўнага афармлення свята ідэі свята, мастацкае адлюстраванне яе сутнасці і спецыфікі. Стылістычнае адзінства мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свят.

Інфармацыйнасць мастацкага афармлення свята. Выкарыстанне ў мастацка-дэкаратыўным вырашэнні свята ведаў і сабраных факталагічных і візуальных матэрыялаў па гісторыі, фальклоры, этнаграфіі, мастацтве вашай мясцовасці; выкарыстанне мастацкіх і іншых адметнасцей вашай мясцовасці на розных этапах свята.

Прапрацоўка і высокая мастацкая культура аб’ёмна-пластычнага выканання кампазіцыйнага твора. Адпаведнасць выкананых работ эскізам, рэжысёрскай і мастацкай задуме, канструктарскім, тэхналагічным і іншым распрацоўкам.

### *Тэма 21. Работа над сцэнаграфіяй дыпломнай пастаноўкі*

Пошук арыгінальнага мастацкага ўвасаблення свята. Афармленне дакументацыі для стварэння мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выкананне праекта комплекснага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята. Актуальнасць. Назва свята (аргументацыя). Тэма, мэта, задачы свята. Час і месца правядзення свята, аргументацыя. Колеравае вырашэнне свята (аргументацыя, візуальная падача). Персанажы свята (аргументацыя, візуальны шэраг). Сімволіка свята (аргументацыя, знак-сімвал, шрыфт). Кампазіцыя свята (лінейная кампазіцыя, каларыстычная пабудова дзеяння). Генеральны план тэрыторыі свята і памежных тэрыторый. Эскізная распрацоўка асобных комплексаў свята (галоўная і іншыя пляцоўкі, выстава, кірмаш, шэсце). Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята. Арганізацыйна-творчыя пытанні рэалізацыі сцэнаграфіі дыпломнай пастаноўкі.

### *Тэма 22. Методыка выкладання дысцыпліны «Сцэнаграфія»*

Методыка выкладання спецдысцыплін. Прадметныя ўзаемасувязі. Мэты і задачы выкладання спецдысцыплін. Адпаведнасць раздзелаў і тэм. Літаратура па прадмеце. Пытанні і заданні для падрыхтоўкі і самападрыхтоўкі. Самаўдасканаленне і самаадукацыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | індыві-дуальныя заняткі | | |
| **Уводзіны** | 2 | | | | |
| Тэма 1. Сцэнаграфія як мастацкая з'ява. Тэрміналагічная база | 2 | 4 | | | |
| **Раздзел I. Тэхніка і тэхналогія сцэны** | | | | | |
| Тэма 2. Сцэнаграфія свята ў закрытым памяшканні | 2 | 6 | | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 3. Класічная сцэна-кодаб. Абсталяванне сцэны | 2 | 6 | | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 4. Сцэнаграфія свята на адкрытай прасторы | 2 | 8 | | 2 | прэзента-цыя |
| **Раздзел II. Асновы мастацкага вырашэння свята** | | | | | |
| Тэма 5. Асновы кампазіцыі | 2 | 6 | 2 | 4 | прэзента-цыя |
| Тэма 6. Колеразнаўства | | 6 | 4 | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 7. Вобразныя сродкі сцэнаграфіі свята | | 6 | 2 | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 8. Стылістычнае адзінства. Жанравыя асаблівасці сцэнаграфіі свята | 2 | 6 | | 2 | праверка самастой-най работы |
| **Раздзел III. Канцэпцыя сцэнаграфічнага вырашэння сучаснага свята** | | | | | |
| Тэма 9. Сучасная сцэнаграфія. Сцэнаграфія сучасных свят Беларусі | 2 | 6 | 2 | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 10. Матэрыяльная і нематэрыяльная культура Беларусі ў кантэксце сучаснага свята | 2 | 6 | 2 | 2 | праверка самастой-най работы |
| Тэма 11. Выбар і афармленне канцэпцыі мастацка-дэкаратыўнага вырашэння трох свят | 2 | 6 | 2 | 2 | праверка самастой-най работы |
| Тэма 12. Кампазіцыя свята | | 4 | | 2 | праверка самастой-най работы |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Тэма 13. Колеравае вырашэнне свята | | 4 | | | |
| Тэма 14. Персанажы свята. Касцюміраванне, грым | 2 | 6 | | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 15. Сімволіка свята | | 6 | | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 16. Месца свята | | 4 | | 2 | прэзента-цыя |
| Тэма 17. Рэкламна-інфармацыйны матэрыял свята | 2 | 6 | 2 | 2 | прэзента-цыя |
| **Раздзел IV. Работа мастака-пастаноўшчыка над комплексным мастацка-дэкаратыўным вырашэннем свята** | | | | | |
| Тэма 18. Творчая група сцэнаграфіі свята і галоўныя прынцыпы яе работы | 2 | 2 | | | |
| Тэма 19. Складанне праекта комплекснага мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята | 2 | 6 | 2 | 2 | праверка самастой-най работы |
| Тэма 20. Крытэрыі ацэнкі мастацкіх вартасцей эскізаў і выкананых работ | 2 | 4 | | 2 | праверка самастой-най работы |
| Тэма 21. Работа над сцэнаграфіяй дыпломнай пастаноўкі | 2 | 8 | 2 | 4 | праверка самастой-най работы |
| Тэма 22. Методыка выкладання дысцыпліны «Сцэнаграфія» | 4 | | 2 | 2 | праверка самастой-най работы |
| **Усяго…** | **36** | **116** | **22** | **42** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Афанасьев, Д. В.* Пространственное оформление спектакля / Д. В. Афанасьев. – Л. : Искусство, 1990. – 140 с.

*2. Базанов, В. В.* Техника и технология сцены / В. В. Базанов. – Л. : Искусство, 1976. – 193 с.

*3. Валодзіна, Т. В.* Семантыка рэчаў у духоўнай спадчыне беларусаў / Т. В. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 1999. – 167 с.

*4.* Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987.

*5. Гуд, П. А.* Беларускі купальскі комплекс і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск : Тэхнапрынт, 1999. – 221 с.

*6. Кацар, М. С.* Беларускі арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. С. Кацар ; навук. рэд. Я. М. Сахута. – Мінск : БелЭн, 1996. – 208 с.

*7. Крук, І. І.* Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – Мінск : Ураджай, 2001. – 350 с.

*8. Лебедев, М.* Режиссер – художник, художник – режиссер / М. Лебедев, Е. Вандалковский. – М. : Мол. гвардия, 1987. – 121 с.

*9. Миронова, Л. Н.* Учение о цвете / Л. Н. Миронова. – Минск : Выш. шк., 1993. – 463 с.

*10. Мюллер, В. Н.* Декорационное оформление спектакля / В. Н. Мюллер. – М. : Искусство,1956. – 101 с.

*11. Немиро, О. В.* Праздничный город. Искусство оформления праздников. История и современность / О. В. Немиро. – Л. : Искусство, 1987. – 96 с.

*12. Раманюк, М. Ф.* Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск: Беларусь, 1981. – 473 с.

*13. Санникова, Л. И.* Художественный образ в сценографии / Л. И. Санникова. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2017. – 144 с. ; То же [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e.lanbook.com/book/90833. – Дата доступа: 20.04.2017.

*14. Сахута, Я. М.* Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 1980. – 215 с.

*15. Френкель, М.* Современная сценография / М. Френкель. – М. : Наука, 1980.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. *Цітоў, А. К.* Гарадская геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : Полымя, 1989. – 207 с.

17. *Цітоў, А. К.* Сфрагістыка і геральдыка Беларусі / А. К. Цітоў. – Мінск : РІВШ БДУ, 1999. – 176 с.

18. *Чантурия, В. А.* История архитектуры Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Выш. шк., 1977. – 319 с.

19. *Чернышев, О. В.* Формальная композиция. Творческий практикум / О. В. Чернышев. – Минск : Харвест, 1999. – 312 с.

20. *Шароев, И. Г.* Режиссура эстрады и массовых представлений / И. Г. Шароев. – М. : Искусство, 1986. – 123 с.

21. *Шверубович, В. В.* Режиссер и оформление спектакля / В. В. Шверубович. – М. : Искусство, 1955. – 234 с.

22. Этнаграфія Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1989.

*Дадатковая*

1. *Васильев-Вязьмин, И. И.* Искусство людных площадей / И. И. Васильев-Вязьмин. – М. : Искусство, 1977. – 124 с.

2. *Васілевіч, У. А.* Міфы бацькаўшчыны / У. А. Васілевіч. – Мінск : БелЭн, 1994. – 109 с.

3. *Градова, К. В.* Театральный костюм / К. В. Градова, Е. А. Гутина. – М. : Искусство, 1976. – Т. 1. – 132 с.

4. *Градова, К. В.* Театральный костюм / К. В. Градова. – М. : Искусство, 1987. – Т. 2. – 143 с.

5. *Зайкоўскі, Э. М.* Жыватворныя крыніцы Беларусі / Э. М. Зайкоўскі, Л. У. Дучыц. – Мінск : Ураджай, 2001. – 111 с.

6. *Караткевіч, У.* Зямля пад белымі крыламі: нарыс / У. Караткевіч. – Мінск : Мастац. літ., 1977. – 176 с.

7. *Кулагин, А. И.* Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии, вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. И. Кулагин. – Минск : Наука и техника, 1981. – 134 с.

8. *Лакотка, А. І.* Пад стрэхамі прашчураў / А. І. Лакотка. – Мінск : Полымя, 1995. – 384 с.

9. *Ляўкоў, Э. А.* Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. А. Ляўкоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 215 с.

10. *Немиро, О. В.* В город пришел праздник. Из истории художественного оформления советских массовых празднеств / О. В. Немиро. – Л. : Искусство, 1973. – 121 с.

11. *Силин, А. Д.* Площади – наши палитры / А. Д. Силин. – М. : Искусство, 1982. – 134 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*12.* Сцена: журнал. – 2013–2016.

*13. Федорук, А. Т.* Садово-парковое искусство Белоруссии / А. Т. Федорук. – Минск : Ураджай, 1989. – 247 с.

*14. Хадыка, А. Ю.* Непаўторныя рысы: З гісторыі беларускага партрэта / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.

*15.* Художник и город : сб. статей. – М. : Искусство, 1988. – 134 с.

*16.* Художник и зрелище : сб. статей. – М. : Искусство, 1990. – 99 с.

*17. Цітоў, А. К.* Менск – места майстроў: Рамесныя цэхі XVI–XVIII стст. / А. К. Цітоў. – Мінск : Беларусь, 2002. – 110 с.

*18. Чантурия, В. А.* Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1986. – 240 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Арганізацыя самастойнай работы па вучэбнай дысцыпліне

Самастойная работа студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» выконваецца па прапанаванай форме і тэматыцы: збор ілюстрацыйнага і фактaлагічнага матэрыялу па матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры Беларусі ўсіх часавых і стылістычных кірункаў; пра знакамітых гістарычных асоб; распрацоўка тэматыкі, часу, месца правядзення і мастацкага вобраза трох разнапланавых свят; распрацоўка кампазіцыі, колераў свят; эскізная распрацоўка візуальнага аблічча персанажаў свята, бутафорыі, падбор аналогій касцюмаў, абутку, галаўных убораў, парыкоў, рэквізіту, бутафорыі і мэблі для нумара, прадстаўлення, свята; распрацоўка ўсіх этапаў работы мастака-пастаноўшчыка над комплексным мастацка-дэкаратыўным вырашэннем свята для абмеркавання на практычных і індывідуальных занятках; азнаямленне з работай мастацка-пастановачных груп канцэртных залаў, міжнародных, рэспубліканскіх, абласных і гарадскіх фестываляў, свят, прадстаўленняў; аналіз святочных і тэатральных пастановак, тэатральных і іншых сцэнічных пляцовак; прагляд і аналіз эскізаў, малюнкаў, кіна-, відэаматэрыялаў з запісамі свят для розных узроставых катэгорый насельніцтва; непасрэдны ўдзел у стварэнні сцэнаграфіі свят. Формы выканання самастойнай работы: напісанне рэферата; аналіз сцэнаграфіі тэатральнай пастаноўкі; аналіз сцэнаграфіі свята; распрацоўка сцэнаграфіі трох свят, распрацоўка візуальнай прэзентацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Для кантролю засваення студэнтамі вучэбнага матэрыялу вучэбнай дысцыпліны «Сцэнаграфія тэатралізаванага прадстаўлення і свята» выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

– метады вуснай дыягностыкі (апытанне, гутаркі, дыскусіі, дыспуты, аналіз творчых работ, залік, экзамен);

– метады практычнай дыягностыкі (удзел у сумесным выбары і афармленні канцэпцыі мастацка-дэкаратыўнага вырашэння свята; выкананне вучэбна-творчых заданняў выкладчыка);

– метады графічнай дыягностыкі (рэферат, пісьмовая работа па афармленні канцэпцыі сцэнаграфічнага вырашэння свята; стварэнне мультымедыйнай прэзентацыі па абранай тэме);

– інтэрактыўныя метады дыягностыкі (дэманстрацыя аўтарскай канцэпцыі свята, ролевая гульня, сітуацыйныя задачы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СЦЭНАГРАФІЯ ТЭАТРАЛІЗАВАНАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ І СВЯТА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці
1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,81. Ул.-выд. арк. 1,21. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ